# НЯСВІЖ ЯК АДЗІН З АСНОЎНЫХ ЦЭНТРАЎ МАСТАЦКАЙ АДУКАЦЫІ НА БЕЛАРУСІ ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XVII — XVIII СТСТ.

***В.П.Пракапцова***

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Калі акінуць позіркам той шлях, які адолела мастацкая адукацыя ад Ранняга Сярэднявечча да эпохі Асветніцтва, нават нетрываласць і складанасць агульнай гістарычнай рэтраспектывы не можа схаваць таго істотна новага, што сфармавалася ў мастацка-адукацыйнай сістэме Беларусі XVIII ст. У гэты час усталёўваецца новы прынцып функцыянавання навучальных устаноў, які можа быць разгледжаны як пэўная, якасная кульмінацыя. Мастацкая адукацыя і выхаванне (а сюды адносіцца музычная, тэатральная адукацыя і навучанне ў галіне выяўленчага мастацтва) грунтаваліся на падставе распаўсюджання ідэй Асветніцтва, якое абумовіла прыярытэт асветы, навукі і розуму ў жыцці асобы, грамадства і дзяржавы, а таксама развівалася ў двух накірунках: культавым і свецкім.

Музычная адукацыя адказвала тым неабходным творчым прынцыпам, якія пранізвалі музычную практыку. Навучанне ва ўстановах, якія фармаваліся на аснове дзейнасці арганізацый розных канфесій, насіла дыдактычна, функцыянальна накіраваны характар. Сюды адносяцца бурсы, заснаваныя каталіцкай царквой, брацкія школы,

якія ствараліся праваслаўнымі ўстановамі, і езуіцкія калегіумы.

Музычныя бурсы існавалі ў XVII ст. у шматлікіх гарадах Беларусі, у тым ліку ў Нясвіжы. Гэта былі своеасаблівыя школы-інтэрнаты, дзе навучаліся дзеці з бедных сем'яў. Сярод прадметаў, якія выкладаліся, былі асновы кампазіцыі, ігра на розных інструментах. Сярод музычных інструментаў, што былі вядомы ў той час на Беларусі і ўжываліся ў выканаўчай практыцы (як у межах народнага, так і прафесійнага музіцыравання), можна назваць арган, флейту, трубу, дуду, ліру, цымбалы, скрыпіцу і інш. Навучанне ў музычных бурсах працягвалася тры гады і было бясплатным.

Тэатральнае і музычнае выхаванне наладжвалася і ў такіх агульнаадукацыйных установах, як езуіцкія калегіумы. З мастацтвам музыкі, тэатра, харэаграфіі навучэнцы знаёміліся на ўроках спеваў, інструментальнай ігры, танцаў, а таксама падчас школьных тэатральных пастановак. Дзейнасць калегіума ў Нясвіжы вызначаецца ў значнай ступені працай у ім у 1625 — 1626 гг. выдатнага настаўніка рыторыкі, новалацінскага паэта, філосафа, тэолага, тэарэтыка літаратуры і красамоўства Мацея Сарбеўскага (1595 — 1640). Даследчыкі адзначаюць таксама, што ён быў і таленавітым музыкантам.

Асноўны прадмет, які выкладаў М.Сарбеўскі, рыторыка. Выкладчыкі гэтай дысцыпліны станавіліся аўтарамі п'ес, паводле якіх ставіліся школьныя спектаклі. Пры стварэнні рэпертуара школьнага тэатра галоўнай мэтай былі вырашэнне не мастацкіх, а прэстыжных і утылітарна-дыдактычных задач. Маральная накіраванасць спектакля садзейнічала выпрацоўцы ў вучняў адпаведных эстэтычных густаў, хрысціянскіх дабрачыннасцей.

Тэатральнае выкананне, якое вызначылася Правіламі аратарскага мастацтва, выкладалася ў «Рыторыках». Мацей Сарбеўскі ў сваёй «Паэтыцы» адзначае адметнасць усіх сродкаў выразнасці спектакля, сінтэтычнае адзінства ігры акцёраў, музычнага і дэкарацыйнага афармлення, асвятлення спектакля.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Педагогі калегіума выступалі і ў якасці мастакоў. Напрыклад, Ян Тадэвуш Клаўс, выкладчык спеваў і тэалогіі ў калегіях Слуцка, Мінска і Нясвіжа ў пачатку XVIII ст., «арганізаваў прадстаўленні ў тэатральныя і школьныя святы і рыхтаваў для іх вынаходлівыя дэкарацыі» (Гісторыя беларускага тэатра. Т. 1. — С. 144). Выкладчык не толькі займаўся афармленнем спектакляў, але і аб'ядноўваў вакол сябе вучняў, якія пераймалі настаўніцкі вопыт і прафесійныя навыкі.

Пры Нясвіжскім езуіцкім калегіуме ў 1696 — 1758 гг. існаваў школьны тэатр. Падрыхтоўка выканаўчых кадраў, як у галіне драматычнага, так і ў галіне музычнага мастацтва, для школьнага тэатра вялася мэтанакіравана, функцыянальна вызначана. Непасрэдна ў ім праводзілася прафесійнае выхаванне, вучоба і практычная дзейнасць развіваліся непасрэдна, як шматгранны працэс адзінай з'явы.

З Нясвіжам XVII ст. звязана дзейнасць яшчэ аднаго навукоўца і педагога — Сігізмунда Лаўксміна (1596 — 1670). У сваёй разнастайнай дзейнасці ён удзяляў шмат увагі тэатральнай і музычнай адукацыі. З 1631 па 1635 г. у Нясвіжы ён выкладаў паэтыку, а ўвогуле займаўся філасофіяй, музычнай і літаратурнай дзейнасцю. С.Лаўксмін стаў аўтарам першых айчынных падручнікаў па грэчаскай мове, музыцы і рыторыцы. Яго праца «Практычнае красамоўства, або Правілы рытарычнага мастацтва» выкарыстоўвалася ў XVII — XVIII стст. як падручнік і двойчы выдавалася ў Рэчы Паспалітай і адзінаццаць разоў — у гарадах Заходняй Еўропы.

У XVIII ст. на Беларусі пачалі арганізоўвацца першыя спецыяльныя мастацкія адукацыйныя ўстановы свецкага накірунку. Функцыянаванне музычных, тэатральных, балетных школ зыходзіла з рэалій культурна-гістарычнага працэсу і было абумоўлена дзейнасцю прыгонных маёнткавых тэатраў і неабходнасцю падрыхтоўкі кадраў для іх. Падставы для шырокага распаўсюджання спецыяльных навучальных устаноў былі вельмі грунтоўныя, бо на Беларусі да падзелу Рэчы Паспалітай існавалі 26 аперна-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

балетных тэатраў і каля 30 сімфанічных капэлаў. Канцэртна-тэатральныя відовішчы патрабавалі вялікай колькасці музыкантаў-інструменталістаў, вакалістаў, артыстаў балета і драмы, мастакоў-дэкаратараў, бутафораў і іншых прадстаўнікоў музычна-тэатральных прафесій. Маёнткавая культура аказала асноватворчы ўплыў на фармаванне і дзейнасць мастацка-адукацыйных устаноў.

Менавіта ў Нясвіжы ў 1748 г. з'явілася першае стацыянарнае тэатральнае памяшканне, перароблене з княжацкага манежа (архітэктар К.Ждановіч), якое змяшчала да 1000 чалавек. У аздабленні тэатра прымалі ўдзел мясцовыя мастакі К.Д.Гескі, М.Скжыцкі, Мікалаеўскі, якія, магчыма, мелі дачыненне і да стварэння дэкарацый. Нясвіжскі тэатр стаў той асновай, дзе ўсталяваўся цесны саюз паміж музыкай, харэаграфіяй, жывапісам, сцэнічнай дзеяй. Пазней, у сярэдзіне 1780 г., над афармленнем тэатральных пастановак працавалі мясцовыя мастакі С.Цыбульскі, Мартэльмонс, а таксама спецыяльна запрошаны для стварэння дэкарацый для «Агаткі» К.Атасельскі.

У тэатральных паказах прымалі ўдзел кадэты Нясвіжскай «Рыцарскай школы». З 1749 г. у праграму іх навучання, якая асноўвалася на даволі шырокай сістэме свецкай адукацыі, была ўведзена падрыхтоўка сцэнічных выступленняў — драматычных і балетных, што забяспечваў Я.П.Фрычынскі, арганізатар амаль усіх нясвіжскіх пастановак.

Амаль ва ўсе спектаклі — як драматычныя, так і оперныя — уключаўся балет. Для падрыхтоўкі прыгонных «балетнікаў» і «балетніц» пры Нясвіжскім тэатры М.К.Радзівілам Рыбанькай была створана балетная школа (1758 — 1790 гг.?). Артысты балета набіраліся з дзяцей прыгонных. Першым кіраўніком балетнай школы стаў Л.М.Дзюпрэ (1758 — 1760 гг.), танцор, які вызначаўся грацыёзнасцю і пластычнасцю рухаў і з'яўляўся адным з заснавальнікаў мужчынскага класічнага танца. У кантракце было запісана, што ён будзе таксама вучыць дзяцей і маладых людзей для балета ў тэатры (Гісторыя беларускага тэатра. Т. 1. — С. 195). М.К.Радзівіл быў задаволены:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Упершыню хлопчыкі і дзяўчынкі выконвалі балет, добра ў іх атрымлівалася» (там жа). Таксама ў балетнай школе выкладалі французскі «мэтр танцаў» Якуб Аліўе (з 1762 г.), прыгонны балетмайстар Антон Лойка (з 1779 г.), Гаэтан Петынеці (з 1780 г.). Першым балетам з удзелам навучэнцаў школы стаў «Балет з Арлекінам».

У гэты ж перыяд (1760 — 1780 гг.) дзейнічала і спецыяльная тэатральная школа, што пацвярджае дагавор, у якім значылася, што С.Закжэўскі і М.Вернеруўна павінны будуць «навучаць аддадзеных ім дзяцей, як дзяўчынак, так і хлопчыкаў, на роднай іх мове для «камедыегаўза», вельмі старанна з імі практыкавацца» (Гісторыя беларускага тэатра. Т. 1. — С. 195, 199.).

Дзейнасць Нясвіжскай капэлы — прыдворнага аркестра князёў Радзівілаў, які існаваў у 1724 — 1809 гг., і Нясвіжскага тэатра Радзівілаў (1740 — 1791 гг.) забяспечвалася ў пэўнай ступені функцыянаваннем музычнай школы. Вызначальным прынцыпам фармавання музычнага асяроддзя стала эстэтыка свецкага мастацтва з багаццем аркестравага гучання, сольнага выканальніцтва, прыгажосцю вакалу. Вучняў, якіх набіралі з сялян Нясвіжа і навакольных вёсак, вучылі іграць на скрыпцы (выкладчык Дж.Канстанціні), віяланчэлі (выкладчык І.Фляйшман), флейце (выкл. Кёнітцэр), габоі (выкл. Я.К.Фішэр), фаготе (Ф.Хофман), валторне (Вентцэль), трубе, басе. Выкладалі вакал В.Нікаліні, Калаўш, Герман. Зразумела, што выкладчыкі былі і асноўнымі выканаўцамі ў капэле і оперным тэатры.

Капельмайстрамі працавалі Е.А.Бакановіч (з 1749 г.) і прыгонны скрыпач Я.Цэнціловіч (з 1751 г.), дырыжорамі — Ф.Вітман (з 1756 г.), Я.Шоль (клавесініст, з 1761 г.), Д.Кёрнер (з 1770 г.), якія таксама выкладалі ў школе. Акрамя названых, педагагічнай дзейнасцю займаліся Я.Голанд (клавесін), Я.Друсік (фартэпіяна), Дж.Альберціні (клавесін, капельмайстар).

Да запрашэння ў Нясвіж гэтыя музыканты былі ўжо вядомыя ў еўрапейскіх краінах. Ян Давід Голанд (1746 — пасля 1825 г.), польскі кампазітар нямецкага паходжання, у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Нясвіжы працаваў з 1780 па 1802 г., у 1802 — 1825 гг. выкладаў тэорыю музыкі ў Віленскім універсітэце. У Нясвіжы ім былі напісаны сімфоніі, серэнады, паланэзы, дывертысменты, кантата (1786), а таксама вядомая аперэта «Агатка» і опера «Войт альбанскага паселішча» на лібрэта М.Радзівіла, прэм'еры якіх і адбыліся ў Нясвіжскім тэатры.

Ян Друсік (1760 — 1812) — чэшскі піяніст, арганіст і кампазітар, які ўдасканальваў майстэрства ігры на фартэпіяна ў К.Ф.Э. Баха, працаваў у Нясвіжы з 1786 па 1788 г.

Джаакіна Альберціні (1751 — 1811), італьянскі кампазітар, узначальваў капэлу Радзівілаў у Нясвіжы ў 1781 — 1784 гг., дырыжыраваў аперэтай Я.Голанда «Агатка» (1784).

Пры магнацкіх дварах быў вялікі штат майстроў будаўнічага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Пры Нясвіжскім двары ў 1758 г. лічылася 85 рамеснікаў, якія не толькі падтрымлівалі агульны стан палацавых будынкаў, але і пастаянна аднаўлялі іх убранства.

Як вядома, Нясвіжскі касцёл езуітаў быў пабудаваны ў 1584 — 1593 гг. італьянскім архітэктарам Дж.М.Бернардоні і з'яўляўся адным з першых ва Усходняй Еўропе будынкаў стылю барока. Манументальна-дэкаратыўны роспіс храма рабіў прыдворны мастак Радзівілаў Ксаверый Даменік Гескі — старшы (? — 1764). Ён прафесійна выхаваў некалькі мастакоў, даў ім спецыяльныя мастацкія навыкі. Сярод іх былі: яго сын Юзаф Ксаверый, а таксама «казённыя мастакі» Скажыцкі, Лютніцкі, Зацэаконт, Андрэй і Канстанцін. Ксаверый Даменік Гескі быў таксама аўтарам дэкарацый да «камендыягаўза» ў Нясвіжы, узораў — так званых кардонаў — да габеленаў, якія ткаліся на мануфактурах у Карэлічах, Нясвіжы, Міры.

Своеасаблівымі метадычнымі дапаможнікамі пры жывапісным аздабленні храмаў, выкананні ікон, падрыхтоўцы кардонаў для габеленаў сталі графічныя друкаваныя выданні, так званыя кажбушкі. Апошнія сталі асноўнымі дапаможнікамі для малявання і разбярства. Гравюры беларускіх, украінскіх, заходнееўрапейскіх старадрукаваных

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

кніжак выкарыстоўваліся ў якасці ўзораў для мастацкага афармлення арганаў, інтэр'ераў касцёлаў, дэкаратыўнага аздаблення ікон і г.д. Для стварэння аб'емнай дэкаратыўнай разьбы выкарыстоўваўся вялікі набор інструментаў. Напрыклад, у інвентары Нясвіжа 1779 г. узгадваюцца 32 назвы і 100 відаў цяслярных інструментаў.

У канцы XVII — пачатку XVIII ст. вядомымі становяцца ткацкія мануфактуры па вырабе шпалераў, ворсавых дываноў, якія адкрыліся ў Слуцку, Нясвіжы, Міры, Гродне, Слоніме, Ружанах, Дуброўне і інш. Першапачаткова на іх працавалі запрошаныя французскія, бельгійскія і іншыя замежныя майстры, якія ў хуткім часе і падрыхтавалі мясцовых ткачоў і ткачых, навучылі іх новым тэхналогіям.

У XVIII ст. вядомы былі і «персіярні» — майстэрні па вырабе шаўковых і «літых» паясоў у Слуцку, Гродне, Альбе пад Нясвіжам. Спачатку паясы ткалі на ўзор персідскіх матываў (адкуль пайшла і назва майстэрань). Спецыяльная падрыхтоўка мясцовых майстроў абумовіла выкарыстоўванне беларускіх матываў як асновы арнаменту.

Такім чынам, Нясвіж у XVII — XVIII стст. быў адным з буйнейшых цэнтраў мастацкай адукацыі на Беларусі. Культавыя і свецкія навучальныя ўстановы забяспечвалі падрыхтоўку музыкантаў-інструменталістаў, вакалістаў, артыстаў балета і драмы, выхоўвалі мастакоўжывапісцаў, дэкаратараў, ткачоў і г.д. У Нясвіжскіх калегіуме, бурсе, спецыяльных музычнай, тэатральнай, балетнай школах працавалі выкладчыкі, што мелі еўрапейскую вядомасць, якія і далі сваім вучням глыбокія спецыяльныя веды, забяспечылі іх прафесійнае прызнанне ў будучым.

Нясвіжскія мастацкія адукацыйныя ўстановы пакінулі ў гісторыі сляды, прыкметныя і ў сучаснасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ